# СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ, ТАВАРЫШЫ!

*ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 17 (189) | Чацвер, 9 мая 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.



М. Кантарыя і М. Ягораў, якія ўзнялі Савецкі сцяг над рэйхстагам.
(Фотахроніка ТАСС).

МІНУЛА 29 гадоў з таго часу, калі Савецкая Армія завяршыла разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 1418 дзён і начэй працягвалася самая грандыёзная ў гісторыі бітва. Вераломна напаўшы на нашу Радзіму, фашысцкая Германія абрушыла на яе ўдар велізарнай сілы. У першыя дні вайны гітлераўскае камандаванне ўвяло ў дзеянне 191 дывізію, 3712 танкаў, 47260 гармат і мінамётаў. Сухапутныя часці падтрымліваліся прыкладна пяццю тысячамі самалётаў і ваенна-марскім флотам. На савецкую зямлю ўступіла больш 5,5 мільёна добра абучаных фашыстаў. Мэта акупантаў была вельмі жудаснай. Яшчэ перад самай вайной на адной з нарад вышэйшых афіцэраў сваёй арміі Гітлер заявіў: «Размова ідзе аб барацьбе на знішчэнне... Вайна будзе рэзка адрозніваецца ад вайны на Захадзе. На ўсходзе жорсткасць з'яўляецца дабрабытам для будучага...».

Гітлераўцы ставілі перад сабой задачу не толькі запаланіць нашу краіну, але і знішчыць савецкіх людзей, назаўсёды пакончыць з сацыялістычнай дзяржавай працоўных.

# ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА

Узброеныя сілы Краіны Саветаў у пачатку вайны знаходзіліся ў вельмі нявыгадным становішчы. Савецкая Армія была не адмабілізавана, яе асноўныя часці размяшчаліся пераважна ў цэнтральных раёнах краіны. Да таго ж як раз праходзіла пераўзбраенне арміі навейшымі танкамі, самалётамі, артылерыяй і іншымі відамі зброі, якіх прамысловасць выпускала яшчэ недастаткова.

Усю цяжкасць першага ўдару ўзялі на сябе пагранічнікі, а таксама воінскія часці, размешчаныя ў пагранічных ваенных акругах.

Дзяржаўны камітэт абароны, які сканцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату дзяржаўнай і ваеннай улады.

Вельмі важна ў той час было супыніць наступленне ворага, выйграць час для падцягнення і стварэння новых рэзерваў, а таксама перабудовы народнай гаспадаркі на ваенны лад. Трэба было забяспечыць фронт дастатковай колькасцю новай баявой тэхнікі і боепрыпасаў.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада наш народ паспяхова вырашыў усе вельмі складаныя задачы.

Нямецка-фашысцкім войскам, выкарыстаўшым першапачатковую перавагу, удалося заняць значную частку нашай тэрыторыі з буйнымі прамысловымі цэнтрамі, захапіць вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў. Над савецкай краінай навісла грозная небяспека: вырашалася пытанне жыцця і смерці, існавання Савецкага Саюза, свабоды яго людзей. Для адпору ворагам трэба было сабраць усе сілы, усю волю народа, пайсці на самыя суровыя выпрабаванні.

Натхняльнікам і арганізатарам савецкіх людзей у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала Камуністычная партыя СССР. Для хутчэйшай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў на абарону краіны 30 ліпеня 1941 года быў створаны

Савецкі ўрад з'явіўся ініцыятарам стварэння антыгітлераўскай кааліцыі, у састаў якой у 1941 годзе ўвайшлі СССР, Англія і ЗША, а да канца 1943 года ў барацьбе супраць гітлераўскага блока было ўжо аб'яднана 59 дзяржаў. Антыгітлераўская кааліцыя адыграла вялікую ролю ў перамозе над фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі. Гэта роля была б яшчэ больш значнай, калі б урады ЗША і Англіі поўнасцю выканалі свае саюзніцкія абавязацельствы ў барацьбе з фашызмам.

З першых дзён вайны ўвесь яе цяжар лёг на плечы савецкага народа, нашай арміі, якая аказвала ворагу ўпартае супраціўленне. Ужо к канцу верасня 1941 года фашысты былі спынены на шэрагу ўчасткаў фронту і панеслі вялікія страты. Баявы дух нашых воінаў быў высокім. Іх стойкасць і бяспрыкладная мужнасць не дазволілі ворагу завалодаць сэрцам нашай Радзімы — Масквой. На подступах да яе адборныя фашысцкія дывізіі былі ўшчэнт разгромлены. Гэта першае буйное паражэнне гітлераўцаў з'явілася паваротнай вяхой у ходзе Вялікай Айчыннай вайны.

У канцы чэрвеня 1942 года фашысцкая армія пачала другое агульнае наступленне ў напрамку на Сталінград. І тут нашы доблесныя воіны не толькі выстаялі, але і закончылі бітву поўным разгромам нямецкай групоўкі войск. Вялікая перамога Чырвонай Арміі пад Сталінградам паклала пачатак карэннаму пералому ў ходзе Вялікай Айчыннай і сусветнай вайны.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

На майскім пасяджэнні Вучонага савета ўніверсітэта абмеркаваны пытанні пастаноўкі вучэбна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў пачатковых курсаў фізічнага факультэта і спецыялізацыі на гісторыка-філалагічным і біёлага-глебавым факультэтах. Заслуханы і абмеркаваны даклады в. а. дэкана У. М. Старыкава, дэканаў Т. І. Язэпавай і С. Ф. Алешкі.

Вучоны савет прыняў пастановы, якія накіраваны на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў пачатковых курсаў фізічнага факультэта і паглыбленне спецыялізацыі на біёлага-глебавым і асабліва на гісторыка-філалагічным факультэтах.

# У МЯСЦКОМЕ

Адбылося чарговае пашыранае пасяджэнне мясцовага камітэта. У яго рабоце прынялі ўдзел старшыні прафбюро факультэтаў і падраздзяленняў, намеснікі дэканаў па фізічнаму выхаванню, прафгрупоргі.

Заслухана і абмеркавана выступленне старшыні камісіі па ахове працы і тэхнікі бяспекі дацэнта Ю. Ф. Хадакоўскага аб выкананні працоўнага пагаднення за першы квартал 1974 года.

Член мясцкома У. І. Джоеў выступіў з паведамленнем аб ходзе здачы супрацоўнікамі ўніверсітэта норм ГПА.

На пасяджэнні мясцкома абмеркаваны таксама пытанні аб арганізацыі культурнага адпачынку членаў прафсаюза, іх удзелу ў спартыўна-масавай рабоце і іншыя, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

# ДАГАВОР ПАДПІСАН

На працягу апошніх год падтрымліваецца цесная сувязь паміж студэнтамі сельскагаспадарчай школы горада Чэске-Будзеёвіцэ братняй Чэхаславакіі і нашага ўніверсітэта. Дружбу моладзі ўмацоўвае традыцыйны абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. Сёлета таксама нашы рабяты ў перыяд трэцяга семестра выедуць на працу ў Чэхаславацкую рэспубліку, а пасланцы гэтай краіны прыедуць на будоўлі Гомельшчыны.



Напярэдадні Першамайскага свята для заключэння працоўнага дагавору ў Гомель прыязджаў старшыня Славацкага Саюза Моладзі сельскагаспадарчай школы Юры Тэзар. На палескай зямлі яго сустрэлі як самага жаданага госця.

У абкоме камсамола з удзелам чэхаславацкага сябра былі абмеркаваны ўсе пытанні аб узаемным абмене будаўнічымі атрадамі. Заключаны дагавор быў падпісаны Юры Тэзарам і сакратаром камітэта камсамола нашага ўніверсітэта Тамарай Ільянковай на вечары, прысвечаным Першамайскаму святу. Подпісы важакоў моладзі дзвюх вышэйшых навучальных устаноў гарадоў-пабрацімаў былі замацаваны дружнымі апладысментамі ўдзельнікаў урачыстасці.

На святочным вечары выступіў Юры Тэзар. Усхваляваны, ён гаварыў на рускай мове словы вялікай удзячнасці гамяльчанам за цёплы прыём. Юры падкрэсліў, што ён быў вельмі шчаслівы ад таго, што прыехаў у нашу краіну як раз у той дзень, калі закончыў сваю работу XVII з'езд ВЛКСМ, і яму пашанцавала разам ехаць і пагутарыць з дэлегатамі гэтага буйнейшага форуму савецкай моладзі.

У час знаходжання на Гомельшчыне Юры Тэзар разам з камсамольскімі работнікамі наведаў адну з перадавых гаспадарак вобласці, удзельнічаў у Першамайскай дэманстрацыі працоўных, паглядзеў цыркавую праграму, азнаёміўся з усімі славутасцямі горада на Сожы.

Наш чэхаславацкі сябра быў моцна крануты цёплым прыёмам і памятнымі сустрэчамі на Гомельшчыне. Перад ад'ездам на радзіму ён выказаў цвёрдую ўпэўненасць у тое, што дружба паміж моладдзю пароднёных гарадоў будзе развівацца і ўмацоўвацца.

**Л. ДЗЕМЯНЦЕЙ,**
**студэнтка V-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**На здымку:** сустрэча у абкоме камсамола. У цэнтры — **Юры Тэзар.**

**Фота А. Рудчанкі.**

# КАНФЕРЭНЦЫЯ ЛАЎРЭАТАЎ

Чатыры дні ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце праходзіла V-я рэспубліканская канферэнцыя лаўрэатаў агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых прац вышэйшых навучальных устаноў Беларусі.

Вялікую цікавасць у прысутных выклікаў даклад студэнта эканамічнага факультэта нашага ўніверсітэта Валерыя Трухава «Да пытання выбару паказчыка ліцейнай вытворчасці» (навуковы кіраўнік — дацэнт, кандыдат эканамічных навук І .П. Трацэўскі). Гэта даследаванне за глыбокі навуковы змест адзначана дыпломам прэзідыума Беларускага рэспубліканскага савета навукова-тэхнічных таварыстваў.

На канферэнцыі з дакладамі выступілі таксама Мікалай Рухля з факультэта фізвыхавання, Люба Каваленка і Аляксей Кузаўкоў з фізічнага факультэта, аўтар гэтых радкоў. Тэзісы нашых дакладаў будуць апублікаваны ў зборніку канферэнцыі.

**У. ЕЎТУХОЎ,**
**студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта.**

СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ



Студэнт трэцяга курса Віктар Асіпенка лічыцца адным з лепшых студэнтаў факультэта. У яго заліковай кніжцы толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Фотакарэспандэнт нашай газеты зафатаграфаваў Віктара ў машыннай зале вылічальнага цэнтра, дзе створаны добрыя ўмовы для навукова-даследчай работы.

## ДАСТУПНА ДЛЯ ЗДОЛЬНЫХ

НАШ факультэт лічыцца адным з самых цяжкіх ва ўніверсітэце. Гэта тлумачыцца тым, што студэнты маюць справу ў пераважнай большасці з дакладнымі навукамі. Каб глыбока і трывала авалодаць імі, акрамя жадання, у нейкай меры яшчэ трэба быць здольным.

Выкладанне спецыяльных дысцыплін на факультэце ажыццяўляюць пяць кафедр: алгебры і геаметрыі, матэматычнага аналізу, дыферэнцыяльных ураўненняў, вылічальных машын і праграмавання, механікі. Гэтыя кафедры непасрэдна рыхтуюць студэнтаў да авалодвання будучай прафесіяй, вядуць іх спецыялізацыю.

На факультэце працуюць вопытныя выкладчыкі, сярод якіх адзін доктар і 14 кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Пачынаючы з першага курса, нашы студэнты ўцягваюцца ў навукова-даследчую работу. Яны пішуць рэфераты, удзельнічаюць у навуковых гуртках кафедр. На старшых курсах авалодванне навукай забяспечваецца праз сістэму спецкурсаў і спецсемінараў па выбранай спецыялізацыі. Вялікае значэнне ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў мае вытворчая практыка. Студэнты праходзяць яе на пятым курсе ў навукова - даследчых інстытутах, сярэдніх школах і на вылічальных цэнтрах заводаў.

Вучэбным планам факультэта прадугледжана таксама глыбокае вывучэнне грамадскіх дысцыплін.

Кожны студэнт можа выбраць для сябе адну з чатырох спецыялізацый: па алгебры, па дыферэнцыяльных ураўненнях, па прыкладной матэматыцы, па тэорыі функцый і функцыйнаму аналізу.

У нашым распараджэнні вылічальны цэнтр з ЭВМ «Мінск-32», «Мір», «Прамень» і лабараторыя клавішных вылічальных машын.

Выпускнікі нашага факультэта накіроўваюцца на працу ў якасці выкладчыкаў матэматыкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы, школы. Іх ахвотна бяруць таксама інжынерамі-праграмістамі вылічальных інстытутаў Акадэміі навук БССР, галіновых навукова-даследчых інстытутаў, прамысловых прадпрыемстваў.

У перспектыве на нашым факультэце мяркуецца адкрыць новую спецыяльнасць — «механіка».

Калектыў выкладчыкаў мехмата прыкладае ўсе свае намаганні для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных сучасных спецыялістаў, якія б валодалі шырокім навуковым кругаглядам і глыбокімі спецыяльнымі ведамі.

Той, хто вырашыў паступіць на наш факультэт, павінен сабе ясна ўяўляць, якое важнае значэнне надаецца цяпер матэматыцы. Матэматызацыя нашых ведаў — адна з істотных асаблівасцей наступіўшай эпохі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Матэматыка, якая даўно гаспадарыць у астраноміі, фізіцы, механіцы, інтэнсіўна пранікае ў галіны, якім раней яна была чужая або іграла нязначную ролю, — у біялогію, медыцыну, геалогію, логіку, сацыялогію і г. д.

Мы чакаем папаўнення, якое б з поспехам змагло авалодаць гэтай складанай і вельмі важнай навукай — матэматыкай.

**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**в. а. дэкана механіка-матэматычнага факультэта, дацэнт.**

# Слова

## ...ВЫПУСКНІКУ

Матэматыка... Для недасведчанага чалавека — гэта «сухая» навука бясконцых сімвалаў і формул. Для нас — гэта цікавы свет загадак і тайнаў. Вось чаму мы імкнуліся вывучыць усё, што дасягнута сучаснай навукай, што выкладалася на факультэце.

Цяжка ўявіць сабе сучаснага студэнта, які не займаўся б навукова-даследчай работай, не цікавіўся апошнімі дасягненнямі навукі. У гэтай справе студэнтамі нашага курса былі дасягнуты пэўныя поспехі. Многія работы выходзілі пераможцамі рэспубліканскіх конкурсаў на лепшую навуковую студэнцкую працу.

Прымаючы эстафету ад старэйшых таварышаў, мы запэўнівалі іх, што будзем дастойна працягваць усе лепшыя традыцыі факультэта і свае слова стрымалі. Ва ўсіх цікавых мерапрыемствах, якія праводзіліся на мехмаце, пяцікурснікі прымалі самы актыўны ўдзел.

Цяпер гэту эстафету мы перадаем студэнтам малодшых курсаў. Апошні крок нам застаецца да самастойнай працы — гэта дзяржаўныя экзамены і абарона дыпломных работ. Гэты заключны рубеж мы пастараемся пераадолець таксама з поспехам.

Мы запэўніваем нашых выкладчыкаў, што зробім усё магчымае, каб найлепшым чынам выкарыстаць тыя веды, той вопыт, якімі яны нас надзялілі.

**У. СЕМЯНЧУК,**
**студэнт V-га курса, дэлегат X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Берліне.**

## ...ПЕРШАКУРСНІКУ

Яшчэ ў школе я марыла паступіць на мехмат. І вось я студэнтка. Ззаду засталася першая, самая страшная сесія. Хутка пачнецца другая. Зноў бяссонныя ночы над канспектамі, хваляванні, перажыванні за сябе і таварышаў. Але каб можна было вярнуцца ў 1973-і год, я б зноў пайшла на мехмат.

Памятаецца, пасля першых дзён вучобы старшакурснікі і выкладчыкі арганізавалі конкурс «Алё, мы шукаем таленты!», у якім прынялі актыўны ўдзел навабранцы. Сярод іх таксама выявілі здольных аматараў мастацкай самадзейнасці — Наташу Мельнікаву, Валю Данільчанка, Святлану Міхалькову, Ірыну Жолудаву і іншых.

Факультэцкая агітбрыгада наладжвае вельмі цікавыя паездкі ў падшэфную вёску. У адным з канцэртаў удзельнічала і я. Асабліва цёпла гледачы сустракалі наш ансамбль «Алгарытм».

13 красавіка нас, першакурснікаў, пасвячалі ў студэнты. Мы далі традыцыйную клятву, а наш камсорг Саша Новікаў падпісаў дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве з выкладчыкамі. Затым пачалося пасяджэнне Клуба вясёлых і знаходлівых «Ану, студэнты! Ану, дацэнты!», на якім выступала каманда выкладчыкаў «Ну, пачакай!» і каманда студэнтаў «13, субота». Гэта спаборніцтва прынесла шмат вясёлых мінут. З розніцай у адно ачко перамаглі выкладчыкі.

У нас на факультэце ўжо з першага курса толькі той лічыцца сапраўдным студэнтам, хто не замыкаецца ў вузкім коле сваіх інтарэсаў, не абмяжоўваецца вучобай, а жыве жыццём усяго студэнцкага калектыву, заўсёды і ўсюды праяўляе высокую грамадскую актыўнасць.

**Л. ЛАРЧАНКА,**
**студэнтка групы М-11.**

## КАМСАМОЛЬСКІЯ СПРАВЫ

Выпускнік школы, які становіцца нашым студэнтам, адразу ж уцягваецца ў кола камсамольскага жыцця. У нас працуе «школа першакурснікаў». Камсамольцы групы М-32 выступаюць у ёй з лекцыямі аб гісторыі і перспектывах развіцця факультэта, аб студэнцкай навукова-даследчай рабоце і па іншых пытаннях. Заняткі праходзяць цікава і карысна для пачынаючых вучобу ў вышэйшай навучальнай установе.

У канцы мінулага года мы ўвялі практыку работы камсамольскіх куратараў. Іх задача — інфармаваць групу аб рашэннях камсамольскага бюро, праводзімых мерапрыемствах, ажыццяўляць кантроль за справамі групы.

Мы пачалі даваць групам і калектыўныя даручэнні. Гэта — напісаць гісторыю факультэцкага СНТ, падрыхтаваць стэнд «Лепшыя студэнты факультэта», «вусны часопіс» і г. д.

Асаблівую цікавасць выклікаў «вусны часопіс». Яго першая старонка была названа «Камсамольскаму XXV-му». Перад студэнтамі выступала дэлегат XXV з'езда ЛКСМБ, сакратар камітэта камсамола ўніверсітэта Тамара Ільянкова. Другая старонка часопіса прысвячалася навуцы, трэцяя адводзілася пачынаючым паэтам мехмата.

Вялікую актыўнасць у студэнтаў выклікалі Ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!» і грамадска-палітычны агляд груп, які прысвячаўся дню нараджэння У. І. Леніна.

На камсамольскіх сходах факультэта абмяркоўваюцца пытанні наведвання заняткаў і паспяховасці студэнтаў, выканання асабістых комплексных планаў і даручэнняў.

Мехматаўцы любяць спрачацца. Бурна прайшоў камсамольскі сход факультэта «Галоўная задача камсамольскай арганізацыі вну — падрыхтоўка высокакваліфікаванага спецыяліста». Нікога не пакінула абыякавым гутарка «Маральнае аблічча савецкага чалавека». Цяпер рыхтуецца агульнафакультэцкі дыспут «Каго наша стагоддзе лічыць сучасным?»

У камсамольскай арганізацыі факультэта шмат цікавых спраў і пачынанняў. Наша задача — зрабіць жыццё кожнага камсамольца яшчэ больш змястоўным і захапляючым.

**Л. СІМАНАВА,**
**сакратар бюро камсамольскай арганізацыі факультэта.**

## ПАД НАДЗЕЙНАЙ АПЕКАЙ

Сёння ні аднаму з нас не страшныя ніякія цяжкасці. Мы штодзённа адчуваем бацькоўскую апеку вельмі лагодных і адначасова строгіх, патрабавальных выкладчыкаў. Яны шчодра перадаюць нам свае глыбокія веды. За гэта мы любім і паважаем сваіх педагогаў.

Пры любой сітуацыі да нас на дапамогу прыходзяць дэкан факультэта Л. Я. Палякоў, намеснік дэкана Н. М. Пакаташкіна. Наша прызнанне таксама выкладчыкам А. В. Гаўрылюку, В. Д. Чартку і многім іншым, хто не шкадуе сіл і часу для таго, каб выхоўваць і рыхтаваць у поўным сэнсе слова высокаадукаваных спецыялістаў.

**А. ХАДАЛЕВІЧ,**
**студэнт групы М-13.**



Ва ўніверсітэце добра аснашчана лабараторыя оптыкі. На практычных занятках — студэнткі мехмата Ала Хацькова і Людміла Юранава.

Фота А. Рудчанкі.

## ЗАГАРТОЎВАЮЦЬ БУДОЎЛІ

Як і многія тысячы студэнтаў краіны, выхаванцы нашага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у руху студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

У працоўным семестры вызначальнага года дзевятай пяцігодкі мехматаўцы будуць працаваць на будоўлях і меліярацыі Гомельшчыны і на гароднінных плантацыях брацкай Малдавіі. Сёлета ўпершыню наш атрад у саставе 17 байцоў будзе працаваць разам з чэхаславацкімі сябрамі.

Удзельнікам працоўнага семестра давядзецца шмат зрабіць для паспяховага выканання заключаных дагавораў, па правядзенню культурна-масавай і ідэйна-палітычнай работы.

Усе байцы нашых СБА паспяхова здалі ўжо экзамен па тэхніцы бяспекі, праходзяць медкамісію. У кожным атрадзе праведзены сходы, на якіх абмеркаваны ўсе пытанні падрыхтоўчага перыяду.

У гэтыя дні члены лектарскіх груп СБА выступаюць з лекцыямі «Аб ролі Ленінскага камсамола ў будаўніцтве камунізму» і «Аб 30-годдзі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў»

**В. ПАРЫЧ,**
**студэнтка III-га курса.**

